© СОЦІУМ. Альманах соціальної історії. Випуск 7. – С. 59–65. © Васіль Варонін, 2007

*Васіль Варонін*

# ВОЙТ-ВАЯВОДА І МЯШЧАНЕ Ў КАНФЛІКЦЕ 1558 ГОДА Ў ПОЛАЦКУ

Адным з наступстваў надання вялікім князем літоўскім Аляксандрам магдэбургскага права Полацку 4 кастрычніка 1498 г. быў канфлікт, які узнік паміж тутэйшымі мяшчанамі і намеснікам (з 1504 г. ваяводам). Іх інтарэсы сутыкнуліся ўжо вельмі хутка, а канфлікт праяўляўся ў будучым з зайздроснай рэгулярнасцю, пераросшы, такім чынам, у хранічны.

У першыя ж гады пасля атрымання Полацкам магдэбургскага права абазначыліся галоўныя лініі канфрантацыі мяшчан і намесніка, якія потым вельмі выразна прасочваліся ў Полацку на працягу ўсёй першай паловы – сярэдзіны XVI стагоддзя. Ужо ў 1499–1500 гг. Аляксандр быў вымушаны прыняць шэраг рашэнняў па спрэчных пытаннях, якія узніклі паміж намеснікам і зноў створанымі гарадскімі ўладамі, якія былі рашуча падтрыманы мяшчанамі[1].

30 снежня 1502 г. справа дайшла да гаспадарскага суда, на якім вялікі князь і паны-рада разгледзелі ўжо ўвесь пералік найбольш вострых спрэчных пытанняў, якія узніклі паміж бакамі да гэтага часу. Скаргу на намесніка Станіслава Глябовіча падалі лентвойт, бурмістры, радцы і «вси мещане места Полоцкого». Сутнасць іх прэтэнзій была выкладзена ў чатырох пунктах. У цэлым яны зводзіліся да таго, што намеснік, насуперак магдэбургскаму прывілею, спрабуе сілай «судити и радити» саміх мяшчан і мяшчанскіх людзей, а таксама «розъеждчати» іх землі; паадбіраў у мяшчан дакументы на землі і людзей, некаторых мяшчан і рамеснікаў сілай забраў пад свой прысуд; спаганяе мыта з мяшчанскіх стругаў на прытоках Дзвіны; спрабуе падпарадкаваць сабе гандаль прывазнымі спіртнымі напоямі – віном і півам. Глябовіч не адмаўляў абвінавачанняў і растлумачыў свае дзеянні так: «там мешкаючи на замъку … полоцком, и не маеть чым пожывитися – прысуды, што з мещан, вси отошли…». У выніку Аляксандр і радныя паны абмежаваліся тым, што далі Глябовічу «в городскии присуд селских путников». Што ж да пунктаў абвінавачванняў, дык па ўсіх чатырох Аляксандр падтрымаў мяш-

[1] Гл.: Полоцкие грамоты XIII – начала XVI вв. / Сост. А.Л. Хорошкевич (далей – ПГ). Вып. 2. Москва, 1978. №№ 230, 231, 239. С. 161–164, 165, 174–176.

[2] Там жа. № 255. С. 197–199.

чан[2]. Праўдападобна, на гэта рашэнне гаспадара, апрача яго агульнай палітыкі падтрымкі гарадоў і мяшчанства, паўплывала таксама ваенная сітуацыя. Лаяльнасць мяшчан такога буйнога горада як Полацк была проста неабходная ва ўмовах вайны з Масквой, якую Вялікае Княства Літоўскае няўдала вяло яшчэ з 1500 г., – і асабліва калі ўлічыць, што гэта быў пагранічны горад.

У наступныя два дзесяцігоддзі супярэчнасці самі сабой не зніклі і спарадычна праяўляліся ў розных спрэчках. Яны, відаць, і падштурхнулі вялікага князя і караля Жыгімонта I да пераразмеркавання ўлады і даходаў паміж ваяводам і службовымі асобамі гарадской (магдэбургскай) адміністрацыі. Прыблізна ў 1525 г. ён надаў пасаду полацкага войта мясцоваму ваяводу Пятру Кішку. Калі разлік быў на тое, што перадача ў адны рукі пасад ваяводы і войта дазволіць залагодзіць супярэчнасці паміж ваяводам і мяшчанамі, дык ён не апраўдаўся. Вельмі хутка канфлікт выбухнуў зноў. Адным з вынікаў пераразмеркавання ўлады стала тое, што функцыі галавы полацкай магдэбургіі перайшлі *de facto* да лентвойта, які і стаў на чале мяшчан пад час разгляду іх новай спрэчкі з ваяводам.

Як сведчыць каралеўскі ліст да Пятра Кішкі ад 10 красавіка 1527 г., лентвойт Станіслаў Ладзя, бурмістры, радцы «и вси мещане места … Полоцкого» апошнім часам неаднаразова скардзіліся гаспадару на ваяводу і абвінавачвалі яго ў розных крыўдах і нават у «зламанье права ихъ майтборского». Аднак у апошняй іх скарзе прэтэнзіі былі высунуты ўжо не толькі да ваяводы, але і да ўладыкі, да князёў, паноў, баяр полацкіх, да ігуменні Спаскага манастыра і манахаў-бернардынаў. Скаргі мяшчан 1527 г. былі падобныя на іх прэтэнзіі 1502 г. Яны зноў абвінавачвалі ваяводу ў тым, што той імкнецца падпарадкаваць свайму прысуду частку мяшчан і мяшчанскіх людзей; прымушае іх несці павіннасці на сваю карысць; уводзіць новыя мыты на прытоках Дзвіны і усталёўвае для мяшчан іншыя незаконныя падаткі. Разам было выказана восем пунктаў прэтэнзій. Па ўсіх іх Жыгімонт Стары падтрымаў мяшчан і загадаў ваяводу вярнуцца да ранейшых парадкаў і адмяніць новаўвядзенні[3] .

Супярэчнасці насілі глыбокі характар, і нават каралеўскія рашэнні не змаглі іх прымірыць. Больш таго, далейшыя падзеі паказалі, што канфлікт не толькі не затухаў, але і ахопліваў усё новыя і новыя сферы, хоць на працягу трох дзесяцігоддзяў разгортваўся толькі прыхавана. Аднак ужо ў 1558 г. ён выбухнуў з новай сілай, прычым менавіта тады набыў найбольш вострыя формы.

На абвастрэнне канфлікта, безумоўна, паўплывала тая ваенна-палітычная сітуацыя, у якой аказаўся Полацк у другой палове 50-х гадоў XVI ст. Горад займаў важнае ваенна-стратэгічнае становішча адразу на дзвюх граніцах Вялікага Княства Літоўскага: з Масквой і з Інфлянтамі. Ніводную з гэтых граніц у Вільні не лічылі тады ані спакойнай, ані бяспечнай, што і пацвердзілі

[3] Акты, относящиеся к истории Западной России / Сост. И. И. Григорович. Т. 2. Санкт-Петербург, 1848. № 147. С. 178–181.

далейшыя падзеі. У 1556–1557 гг. Вялікае Княства Літоўскае ўступіла ў востры канфлікт з інфлянцкімі крыжакамі. Хоць справа да ваенных дзеянняў не дайшла, але збор 20-тысячнага войска на паўночных межах дзяржавы і размяшчэнне гарнізонаў у прылеглых да Інфлянтаў замках сведчаць пра тое, што Жыгімонт II Аўгуст такі варыянт зусім не выключаў[4]. Пагранічнаму Полацку адводзілася тут далёка не апошняя роля. Дастаткова сказаць, што каралеўскае даручэнне разведаць і апісаць усе пераправы і броды на Дзвіне ў 1557 г. атрымаў і паспяхова выканаў менавіта полацкі ваявода Станіслаў Давойна[5]. Напад Івана Грознага на Інфлянты ў студзені 1558 г. (11 мая маскоўскія войскі ўзялі Нарву) у чарговы раз нагадаў пра небяспеку ад гэтага боку і зноў падкрэсліў значэнне Полацка.

У матэрыялах Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага знаходзім незвычайна вялікую судовую справу, прысвечаную разгляду гэтага чарговага полацкага канфлікта[6]. З яе вынікае, што 16 красавіка 1558 г. полацкія мяшчане падалі Жыгімонту II Аўгусту два рэестры, у якіх былі пералічаны 47 скаргаў (27 у першым рэестры і 20 у другім) на дзейнасць полацкага войта і ваяводы Станіслава Давойны. Спачатку гаспадар перадаў іх на разгляд віленскаму ваяводу, канцлеру Вялікага Княства Літоўскага Мікалаю Радзівілу (Чорнаму), які, выслухаўшы абодва бакі, вярнуў справу на канчатковы вырак манарху. 29 красавіка Жыгімонт II Аўгуст разам з панамі-радамі разглядаў справу на судовым пасяджэнні.

Мяшчанскія прэтэнзіі можна падзяліць на некалькі груп. Самую шматлікую складаюць скаргі на незаконныя штрафы і паборы, якія Давойна рэгулярна ці аднаразова спаганяў з мяшчан (скаргі 1, 4, 7, 8, 10, 17, 19, 23-25, 29-34, 36-39, 41). Вельмі многа прэтэнзій датычылася злоўжыванняў лентвойта, які дзейнічаў ужо як давераная асоба войта-ваяводы, а таксама слуг Давойны (скаргі 9, 12-14, 16, 18, 21, 44, 47). Мяшчане абвінавачвалі ваяводу ў незаконным рабаванні і канфіскацыі іх маёмасці, незаконных фізічных пакараннях (скаргі 22, 26, 27, 43). Іх абурэнне выклікалі рашучыя і нават жорсткія дзеянні ваяводы па падтрыманню ў баяздольнасці і належным стане замка, а таксама забеспячэнню пажарнай бяспекі і замка, і «места» (скаргі 35, 42, 45, 46)[7]. Некалькі прэтэнзій было выказана ў сувязі з тым, што войт прымушаў працаваць на сябе за вельмі нізкую плату ці ўвогуле задарма рамеснікаў і кормнікаў (скаргі 3, 11, 20). Войт-ваявода судзіў мяшчан па справах, якія не належалі да яго кампетэнцыі (скаргі 5, 6). Адна скарга датычыла карыстання лесам у

[4] Пра прычыны і ход канфлікта гл., напр.: *Łowmiański H.* Polityka Jagiellonów. Poznań, 1999. S. 566–568.

[5] Гл.: Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России / Под ред. Н.И. Костомарова. Т. 1. Санкт-Петербург, 1863. № 132. С. 140–141.

[6] Российский государственный архив древних актов (далей – РГАДА). Ф. 389, ед. хр. 249, л. 125 об. – 137 об.

[7] Справа дайшла да таго, што Давойна з меркаванняў пажарнай бяспекі загадаў павывозіць «звечные» мяшчанскія дамы з замка, а некаторыя з іх разабраць і аддаць на дровы да кухні (Там жа. Л. 136).

трохмільнай ваколіцы горада (15). І, нарэшце, зноў усплыла старая праблема мыта на Дзвіне і яе прытоках, бо мытнікі ваяводы зноў бралі з мяшчан «мыта непомерные над звычай стародавнъный и прывилей его королевской милости» (скарга 2). Увесь гэты даўгі і разнастайны пералік прэтэнзій мяшчан да Давойны вянчала іх супольная просьба, «абы его королевская милость рачыл дать войта, который бы ихъ подлугъ права майдеборского судилъ и справовалъ и отъ воеводы боронилъ»[8].

Пратакол разгляду справы ў судзе выглядае наступным чынам. Спачатку выкладзена прэтэнзія мяшчан, потым ідзе адказ ваяводы з яго аргументамі і нарэшце таксама падмацаваны аргументамі вырак гаспадара. Некалькі разоў бакі, відаць, уступалі ў спрэчку, чаму дакумент зафіксаваў некалькі выпадкаў дадатковых рэплік, пытанняў і удакладненняў. Увогуле, пратакол малюе даволі напружаную атмасферу пасяджэння. Адзін раз, калі ішла гаворка пра тое, каб павыкідваць мяшчанскія дамы з замка, мяшчане Жыгімонту Аўгусту нават «били чоломъ с плачемъ» – і, падобна, гэта не проста штамп.

Каралеўскім рашэннем 14 скаргаў было задаволена, 19 пытанняў было вырашана на карысць Давойны, па дзвюх скаргах было прынята кампраміснае рашэнне, а разгляд яшчэ дванаццаці адкладзены. Такі вынік рэзка кантрастуе з вынікам канфліктаў 1502 і 1527 гг., калі рашэнні прымаліся амаль што выключна на карысць мяшчан. Канешне, у гэтым адыграла сваю ролю і тое, што каралю і радным панам давялося цяпер разглядаць не толькі агульныя, прынцыповыя пытанні. Шмат мяшчанскіх скаргаў датычыла канкрэтных выпадкаў, і тут мяшчане паказалі сябе не самымі лепшымі знаўцамі права. Шэраг пытанняў быў вырашаны не на іх карысць толькі таму, што яны вельмі доўга (па пяць, восем гадоў) не звярталіся ў суд і, такім чынам, «замаўчалі справу». Гэта ж было дастатковай падставай для таго, каб аўтаматычна зняць абвінавачанне з адказчыка. Аднак факт вырашэння большасці срэчных спраў на карысць ваяводы-войта сведчыць і пра паступовы адыход улады ад рашучай і безумоўнай падтрымкі мяшчанства. Адметная рэч: Давойна падмацоўваў свае сведчанні і сваю пазіцыю неаднаразовымі спасылкамі на полацкіх баяр-шляхту, якія нязменна былі на баку ваяводы. Таму можна упэўнена гаварыць пра існаванне антымяшчанскага альянса ваяводы са шляхтай, а так сама пра тое, што такімі сваімі рашэннямі кароль падтрымліваў не толькі асабіста ваяводу і яго пазіцыю, але і шляхту – праўда, не так яўна.

На апошнюю мяшчанскую просьбу Жыгімонт Аўгуст адказаў у тым сэнсе, што не ён, а яшчэ яго папярэднікі «отъ немалого часу и не безъ причыны войтов полоцъкихъ выставили и на тых пановъ воеводъ полоцъкихъ тотъ врадъ и владность воитовъскую вложыли». Аднак адначасова ён даў абяцанне абдумаць гэта пытанне да прыезду з Кароны ў Вялікае Княства Літоўскае, «а особливе тамъ до того замъку и места … Полоцъкого»[9] – цікавае указанне на намер Жыгімонта Аўгуста, які зусім не быў схільны пускацца ў далёкія

[8] Там жа. Л. 137 об.

[9] Там жа.

падарожжы па сваіх разлеглых уладаннях, наведаць Полацк. У гэтым горадзе ён ніколі не быў і гэты свой намер так ніколі і не здзейсніў.

Судовая справа дае важны матэрыял для высвятлення перадгісторыі і глыбінных прычын канфлікта. Апраўдваючы сваю пазіцыю, Давойна выклаў уласную версію разгортвання падзей, якія прывялі да такой маштабнай скаргі каралю. У адпаведнасці з гэтай версіяй, неспакой сярод мяшчан быў выкліканы інтрыгамі ўсяго трох чалавек. Вось гэтыя «люди злостливые, превротъные» і вінаватыя ў мяшчанскіх хваляваннях. Іх імёны Давойна назваць не захацеў, але паабяцаў зрабіць гэта «инъшымъ часомъ». Паводле яго слоў, менавіта гэтыя мяшчане «тепер збунътовали ихъ всих безъ жадных прычынъ слушъныхъ»[10]. Аднак у ходзе далейшага разбіральніцтва высветлілася, што карані справы былі намнога глыбейшыя і яе нельга прыпісаць ініцыятыве трох зласлівых людзей.

Адной з галоўных прэтэнзій полацкіх мяшчан да Давойны было спагнанне ім штрафа ў памеры 300 коп грошаў, як сцвярджалі мяшчанскія прадстаўнікі, «на всемъ месте». З адказа ваяводы гісторыю са спагнаннем гэтага штрафа можна рэканструяваць наступным чынам. Нейкі час таму даволі вялікая група полацкіх мяшчан з бурмістрамі і лаўнікамі на чале склала дакумент, скіраваны супраць ваяводы і нават, паводле сцвярджэння Давойны, супраць самаго гаспадара. Пад гэтым лістом паставілі свае пячаткі 70 чалавек. Відаць, аўтары дакумента заклікалі далучыцца да іх ініцыятывы сярэднія пласты мяшчанства – паспольства. Больш таго, яны «бунътовали все место». У дакуменце ў нейкім кантэксце фігуравала сума 300 коп грошаў. З матэрыялаў справы гэта не зусім зразумела, але можна здагадвацца, што бурмістры і лаўнікі ці то назвалі яе ў якасці гарантыі таго, што яны не пакінуць «людзей паспалітых» у выпадку іх далучэння да выступлення. Ці то такім чынам яны спрабавалі даказаць усім сур’ёзнасць сваіх намераў і слушнасць сваіх прэтэнзій да ваяводы. Ці то гэтыя грошы былі проста паабяцаны паспольству ў выпадку яго далучэння да гэтага «бунта сямідзесяці». Як бы там ні было, але замест таго каб бунтаваць, «люд паспаліты» проста перадаў гэты ліст ваяводу. Яго бачылі таксама полацкі праваслаўны архіепіскап і, як сцвярджаў Давойна, «вся шляхъта полоцъкая». Азнаёміўшыся са зместам дакумента, ваявода прысудзіў спагнаць з бурмістраў і лаўнікаў (а не з усяго места, як сцвярджалі скаржнікі) гэтыя названыя імі самімі 300 коп у якасці штрафа, «абы черезъ то люду в месте украинномъ не бунътовали».

Звяртае на сябе ўвагу, што ініцыятарамі і, трэба разумець, найбольш актыўнымі падбухторшчыкамі да бунта былі прадстаўнікі мяшчанскай вярхушкі, у тым ліку асобы, якія займалі вышэйшыя службовыя пасады ў магдэбургіі. Паспольства ж, як відаць, не гарэла жаданнем іх падтрымліваць і ісці супраць ваяводы. Мяшчанская супольнасць не была адзінай – у тым ліку і ў сваім стаўленні да розных узроўняў улады.

[10] Там жа. Л. 126–126 об.

Здзіўляе даволі лагодны гаспадарскі вырак і тое, што справе па такому сур'ёзнаму абвінавачанню, як бунт супраць манарха, не быў дадзены далейшы ход. Праўдападобна, ваявода перабольшваў, калі прыпісваў мяшчанам такія намеры. Справа абмежавалася тым, што спагнаны з мяшчан штраф застаўся ў Давойны. Праўда, гаспадарскі вырак прадпісваў ваяводу ў выпадку паўтарэння падобных небяспечных інцыдэнтаў паведамляць пра іх каралю і дзейнічаць у адпаведнасці з атрыманымі ад яго інструкцыямі[11].

Магчыма, мэтай гэтага няўдалага выступлення уплывовай часткі полацкіх мяшчан было адхіленне Давойны ад пасады ваяводы (і аўтаматычна – войта). У адпаведнасці з абласным прывілеем Полацкай зямлі палачане валодалі такім правам[12]. Прэцэдэнт меў месца ў суседнім Віцебску, які таксама меў гэта права. У 1528 ці ў 1529 годзе мясцовыя жыхары, і ў першую чаргу мяшчане дамагліся ад Жыгімонта I Старога замены свайго ваяводы Івана Багдановіча Сапегі[13]. Праўда, апрача рашучай пазіцыі віцяблян, вялікую (ці нават галоўную) ролю ў гэтым адхіленні адыгралі інтрыгі каралевы Боны.

Пасля няўдалай спробы адхіліць Ст. Давойну ад пасады з дапамогай масавых хваляванняў полацкія мяшчане ў 1558 г. вырашылі дзейнічаць іншым чынам. Цяпер яны звярнуліся ў гаспадарскі суд і паставілі за мэту пазбавіць Давойну хаця б пасады войта, не замахваючыся ўжо на ваяводства. Магчыма, справа была ў тым, што для адхілення Давойны ад пасады ваяводы законным шляхам патрабавалася безумоўная падтрымка полацкага баярства. Аднак на яе мяшчане ніяк не маглі разлічваць: баяры-шляхта цвёрда стаялі на баку ваяводы.

Спрэчка мяшчан з Давойнам аказалася паказальнай не толькі ў сэнсе выяўлення іх пазіцый і інтарэсаў. Як аказалася, сутыкнуліся не толькі яны, сутыкнуліся таксама дзве розныя аргументацыі. У падмацаванне сваёй пазіцыі мяшчане настойліва апелявалі да гаспадарскіх прывілеяў, сілай якіх яны атрымалі свае правы і перавагі. Напрыклад, гэтымі прывілеямі яны былі вызвалены ад суда ўсіх ваявод і іх намеснікаў[14]. Зусім па-іншаму выглядалі аргументы Давойны. Ён рабіў націск на прэцэдэнт, на агульнапрынятую ў дзяржаве практыку: «ся такъ заховываеть у инъшыхъ воеводствах», такі парадак існуе «у инъшых городех украиных и Киеве»[15]. Аднак пазіцыя ваяводы пры гэтым выглядала даволі супярэчліва і непаслядоўна. Ён некалькі разоў спасылаўся на існаванне нейкіх парадкаў у іншых рэгіёнах дзяржавы, але калі яму гэта было выгадна, з лёгкасцю прыводзіў у якасці аргумента спасылку на мясцовы полацкі «старадаўні звычай». Зрэшты, спасылка на даўніну захоўвала сваё значэнне і для мяшчан, і для гаспадара.

---

[11] Там жа. Л. 132–133.
[12] ПГ. Вып. 3. Москва, 1980. № 323. С. 90.
[13] Гл.: Акты Литовско-Русского государства. Вып. 1 / Изд. М. В. Довнар-Запольский. Москва, 1899. № 186. С. 209–210.
[14] РГАДА. Ф. 389, оп. 1, д. 249, л. 127 об.
[15] Там жа. Л. 127 об., 130 об.

Канфлікты мяшчан з войтам не былі чымсці унікальным у Вялікім Княстве Літоўскім у гэты час. Канфлікт 1558 г. у Полацку знаходзіць нямала супольных рысаў, напрыклад, з падобным канфліктам, што выбухнуў у 1566 г. ва Ўладзіміры на Валыні[16]. Адак былі, зразумела, і адрозненні.

Полацк быў ці не адзіным адзіным горадам, дзе пасада войта была перададзена ваяводам. Становішча Полацка як буйнога гандлёвага цэнтра і шматлюднага горада, яго значэнне як вельмі важнага пагранічнага замка, трывожная ваенная абстаноўка ў рэгіёне – вось тыя фактары, якія, бадай, наймацней паўплывалі на канфлікт 1558 г. Гэта разумелі ўсе: мяшчане, ваявода-войт, кароль. Мала было проста вычарпаць канфлікт, кожны з бакоў імкнуўся дасягнуць сваіх мэтаў пад час яго разбору і залагоджвання найбольш пякучых праблем. Мяшчане жадалі абараніць свае законныя правы і прывілеі, і ў першую чаргу «право майдеборское». Давойна, які не забываўся пра павелічэнне сваіх прыбыткаў ад пасады войта і ваяводы, быў усё ж абавязаны ў першую чаргу клапаціцца пра абараназдольнасць і бяспеку полацкага замка. Трэба сказаць, ён нямала зрабіў дзеля гэтага – напрыклад, арганізаваў сістэму пажарнай бяспекі замка і «места». У гэтых сваіх захадах ён карыстаўся безумоўнай падтрымкай караля. Больш таго, згодна з адным з каралеўскіх рашэнняў, прынятых пад час разбору канфлікта, усе ўладальнікі пушчаў у радыусе адной мілі ад замка былі абавязаны на працягу аднаго года высекчы іх, бо густыя лясы «праве под замокъ прылегъли». Пры гэтым кіраваліся патрэбамі эфектыўнай ваеннай абароны. Кароль імкнуўся забяспечыць мір, спакой і вернасць сваіх падданых, дамагчыся «безъпечъности и обороны того клейноту не менъшого замъку украинного … полоцкого»[17].

Як бы напружана не выглядала сітуацыя ў Полацку напярэдадні Інфлянцкай вайны, яна, наколькі гэта вядома, не аказала прыкметнага ўплыву на падзеі зімы 1563 г. Мяшчане, мяркуючы па ўсім, захавалі вернасць Жыгімонту Аўгусту і не паддаліся пад час той драматычнай аблогі. Здрады не было. Аднак і тых высілкаў па забеспячэнню абараназдольнасці Полацка, якія прадпрымалі цэнтральныя і мясцовыя ўлады, аказалася недастаткова. Прынамні, яны не змаглі выратаваць горад ад катастрофы 1563 года.

[16] Падрабязна аб падзеях ва Ўладзіміры гл.: *Старченко Н.* Конфлікт у Володимирі 1566 р.: варіант микроісторичного прочитання // СОЦІУМ. Альманах соціальної історії. Вип. 3. Київ, 2003. С. 65–98.

[17] Там жа. Л. 129 об.